Пустаход, Т.С. Лёс маёмасці беларускага вучонага і царкоўнага дзеяча Міхаіла Баброўскага (1784 – 1848) / Т.С. Пустаход // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 9 / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мн.: БДУ, 2014. – с. 95 – 103.

*Т. С. ПУСТАХОД*

# ЛЁС МАЁМАСЦІ БЕЛАРУСКАГА ВУЧОНАГА І ЦАРКОЎНАГА ДЗЕЯЧА МІХАІЛА БАБРОЎСКАГА (1784—1848)

На аснове архіўных матэрыялаў сістэмна разглядаецца лёс маёмасці беларускага вучонага, святара, багаслова, славіста, арыенталіста, гісторыка, палеографа, бібліяфіла канца XVIII — першай паловы XIX ст. Міхаіла Баброўскага. Прадстаўлены спробы сваякоў і ўлад вырашыць пытанне пра лёс маёмасці пасля смерці вучонага ў 1848 г. Аналізуюцца некаторыя бакі жыцця святара, раскрываюцца прычыны беззваротнай страты яго маёмасці.

In this article on the basis of the archival materials the property fate of Michael Bobrovsky, Belarusian scientist, priest, theologian, slavist, orientalist, historian, paleographer, bibliophile of the end of the 18$^{th}$ — the first part of 19$^{th}$ century are systematically considered. Attempts of relatives and authorities to decide on the property fate after the scientist's death in 1848 are presented. In the article some aspects of economic life of the priest are analyzed and the reasons of irrevocable loss of his property are considered.

*Ключавыя словы*: Міхаіл Баброўскі, славіст, протаіерэй, Віленскі ўніверсітэт, маёмасць, Хрыстафор Ховен, Пружанская дваранская апека, Сенат, Гродзенская палата грамадзянскага суда.

*Keywords*: Michael Bobrovsky, a slavist, a protopriest, the Vilnius University, property, inventory, Christopher Hoven, Pruzhanian noble tutelage, the Senate, the House of civil court of Grodno.

Міхаіл Кірылавіч Баброўскі — славіст, багаслоў, арыенталіст, гісторык, палеограф, бібліяфіл, прафесар Віленскага ўніверсітэта. Ён усё сваё жыццё прысвяціў выяўленню, вывучэнню і збіранню помнікаў старажытнай славянскай пісьменнасці, прысвяціў сябе захаванню і зберажэнню старажытнай культуры беларусаў і ўсяго славянства. Менавіта з яго іменем звязана знаходка Супрасльскага рукапісу, вяртанне беларускай і еўрапейскай навуцы імя Францыска Скарыны, апісанне глагалічных і кірылічных кніг і інш.

Міхаіл Баброўскі сабраў вялікую бібліятэку, якая стала першым спецыяльным зборам помнікаў беларускай старадрукаванай літаратуры. Пры жыцці вучонаму ўдалося надрукаваць толькі некалькі сваіх прац. Частка рукапіснай спадчыны знікла адразу пасля яго смерці, другая тра-

**Пустаход Таццяна Сяргееўна** — аспірант кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

піла да бібліяфіла Уладзіслава Транбіцкага, а потым разышлася па розных сховішчах [3, с. 38]. Большая частка гэтых рукапісаў загінула падчас Другой сусветнай вайны. Уцалелі толькі асобныя артыкулы, лісты, нататкі, якія зберагаюцца ў зборах Вільнюса, Кракава, Варшавы, Масквы, Санкт-Пецярбурга і інш. Мабыць, па гэтай прычыне значэнне дзейнасці прафесара да сённяшняга часу не раскрыта ў поўнай меры, нягледзячы на тое, што М. Баброўскі быў вучоным еўрапейскага ўзроўню: з'яўляўся членам прэстыжных Археалагічнай акадэміі ў Рыме, Парыжскага і Лонданскага азіяцкіх таварыстваў, Камітэта па выпрацоўцы харвацкага правапісу ў Далмацыі, Маскоўскага таварыства гісторыі і старарускай пісьменнасці [10, с. 51].

Мэта даследавання — на аснове архіўных матэрыялаў сістэмна разгледзець спробы сваякоў і ўлад вырашыць пытанне аб лёсе маёмасці М. Баброўскага пасля яго смерці. Артыкул грунтуецца на асноўных прынцыпах гістарычнай навукі: гістарызме, аб'ектыўнасці і сістэмнасці. Асаблівае значэнне мае прымяненне спецыяльна-гістарычных метадаў даследавання: гісторыка-генетычнага і гісторыка-тыпалагічнага.

Міхаіл Кірылавіч Бабро́ўскі нарадзіўся 8 лістапада (19 лістапада) 1784 г. у вёсцы Вулька Бельскага павета Гродзенскай губерні ў сям'і ўніяцкага святара Кірыла. Скончыў Клешчальскую школу царкоўнаслужачых (1797), Драгічынскае вучылішча піяраў (1803), Беластоцкую гімназію (1806), Галоўную духоўную семінарыю пры Віленскім універсітэце (1812) [3, с. 31—32]. У 1806—1808 гг. працаваў у Беластоцкай гімназіі. У 1812—1814 гг. М. Бабро́ўскі наведваў курсы правазнаўства пры Віленскім універсітэце і ў 1814 г. стаў магістрам грамадзянскага і крымінальнага права [3, с. 32]. У 1814 г. Савет універсітэта запрасіў яго заняць кафедру Свяшчэннага Пісання ў якасці прафесара. У 1815 г. М. Бабро́ўскі прыняў сан уніяцкага святара, у 1816 г. прызначаны членам Віленскай уніяцкай кансісторыі, у 1817 г. стаў протаіерэем [9, с. 19].

Трэба адзначыць, што М. Бабро́ўскі на працягу пяці год (1817—1822) знаходзіўся ў Аўстра-Венгрыі, Чэхіі, Італіі, Францыі, Славеніі, Далмацыі, дзе вывучаў біблейскую археалогію і багаслоўе, герменеўтыку, славянскія і ўсходнія мовы, даследаваў у архівах і бібліятэках унікальныя калекцыі славянскіх рукапісаў і старадрукаў. Пасля вяртання з навуковай камандзіроўкі вучоны з 1822 па 1833 г. (з перапынкам у 1824—1826 гг.) займаў пасаду прафесара экзегетыкі і герменеўтыкі багаслоўскага факультэта Віленскага ўніверсітэта, выкладаў арабскую мову. У 1823 г. М. Бабро́ўскаму была прысвоена ступень доктара багаслоўя. Пасля паў-

стання 1830—1831 гг. у Польшчы, Беларусі і Літве, закрыцця ў 1832 г. Віленскага ўніверсітэта М. Бабро̆ўскі выйшаў у адстаўку, пераехаў у мястэчка Шарашова Пружанскага павета Гродзенскай губерні, дзе выконваў абавязкі прыходскага святара. У 1839 г. перайшоў у праваслаўе, у 1841 г. быў узведзены ў сан пружанскага благачыннага [7, с. 354]. Памёр М. К. Бабро̆ўскі 21 верасня (3 кастрычніка) 1848 г. ад халеры.

У сувязі з раптоўнай смерцю М. Бабро̆ўскі не паспеў зрабіць ніякіх распараджэнняў адносна дакументаў, якія былі ў яго на руках, уласных рукапісных прац, здымкаў, бібліяграфічных нататак, археалагічных запісаў і лістоў, якія дасылалі вядомыя славянскія філолагі, археолагі, аматары старажытнай славянскай пісьменнасці, такія як чэшскі лінгвіст Й. Дабро̆ўскі, славенскі лінгвіст Б. Капітар, рускі філолаг А. Востакаў, граф М. П. Румянцаў і інш. Вялікую каштоўнасць маюць і лісты, якія дасылалі М. Бабро̆ўскаму наступныя царкоўныя дзеячы: мітрапаліт Літоўскі і Віленскі Іосіф Сямашка, архіепіскап Полацкі і Віцебскі Васілій Лужынскі, архіепіскап Мінскі і Гродзенскі Антоній Зубко і інш.

Падчас смяротнай хваробы М. Бабро̆ўскага з ім побач былі бліжэйшы сусед па прыходзе Іаан Кургановіч і вікарны святар Міхаіл Савінскі [2, с. 37—38]. Спадчыннікі памерлага — пляменнікі Міхаіл Восіпавіч Бабро̆ўскі, калежскі рэгістратар Губернскага праўлення ў Санкт-Пецярбургу, і Павел Восіпавіч Бабро̆ўскі, прапаршчык лейб-гвардыі Літоўскага палка, — знаходзіліся далёка ад Шарашова [4, л. 1].

Пружанская дваранская апека пачала вырашаць пытанне аб лёсе маёмасці М. Бабро̆ўскага толькі праз тры тыдні пасля яго смерці. Да гэтага часу віцэ-благачынны В. Кургановіч (пазней архімандрыт Вікенцій, настаяцель Супрасльскага манастыра) зрабіў вопіс маёмасці вучонага, даў распараджэнне аб перадачы яго бібліятэкі бібліяфілу У. Транбіцкаму, які ў 1847 г. набыў яе ў М. Бабро̆ўскага, але больш паловы сумы не заплаціў [1, с. 102]. Такія дзеянні В. Кургановіча з’яўляліся незаконнымі, таму што маёмасцю спадчыннікаў нябожчыка, які быў нашчадкавым дваранінам, ніхто не мог распараджацца без удзелу дваранскай апекі.

Трэба адзначыць, што ў вопіс маёмасці протаіерэя М. Бабро̆ўскага не былі ўключаны пісьмовыя дакументы, якія належалі вучонаму [2, с. 37]. Пружанская дваранская апека нават не праверыла дакладнасць вопісу. Пратэст і скаргі спадчыннікаў засталіся без задавальнення [4, л. 1].

Пытанне аб лёсе маёмасці выдатнага вучонага канца XVIII — першай паловы XIX ст. да сённяшняга часу не вырашана, аднак пошукі ў гэтым напрамку дапамагаюць асвятліць пэўныя дэталі яго жыцця і дзей-

насці. Трэба адзначыць, што адным з першых беларускіх вучоных, хто асвяціў пэўныя бакі гаспадарчага жыцця М. Баброўскага, быў гродзенскі даследчык В. М. Чарапіца [8].

Вельмі каштоўным у вырашэнні пытання аб лёсе маёмасці М. Баброўскага з'яўляецца «Дело о продаже имущества протоиерея Бобровского за долги» [5]. 4 мая 1849 г. Гродзенская палата грамадзянскага суда паведаміла гродзенскаму грамадзянскаму губернатару, генерал-лейтэнанту і кавалеру, барону Х. Ховену аб тым, што «опекуны малолетних Бобровских и имущества, им принадлежащего, после умершего дяди их, протоиерея Бобровского, просили Пружанскую дворянскую опеку об учинении распоряжения насчет продажи имущества, так как оно может подвергнуться порче, а лошади, скот и прочие животные прокормом причиняют значительный ущерб. Пружанская дворянская опека, имея в виду отзывы Духовной консистории о том, что на покойном Бобровском числится 2064 руб. 96 коп. долга, к удовлетворению которого нет законных средств, кроме имущества покойного, оцененного в 1435 руб. 83 1/2 коп., состоящего из гардероба, белья, лошадей, книг, экипажей и крестьян в имении Обруб, предложила следующее:

1) согласно ходатайству опекунов продать с публичных торгов всё имущество Бобровского, находящееся в м. Шерешево, вывезти всех жаждущих принять участие в торгах при бытности уездного стряпчего, откомандировавшего своего члена Протасевича, которому при том поручила сообразить при торгах, всё ли имущество показано в описи, а равно — от чего произошла разница в количестве скота, ибо по отзывам Духовной консистории показана 31 штука, а в описи —14 штук;

2) медные, серебряные, золотые и прочие вещи не могут быть проданы без разрешения высшего начальства;

3) от пружанского благочинного В. Кургановича выяснить сведения о долгах, относимых к покойному Бобровскому, доказательства на оные, о первоначальной описи его имущества, а также уведомления, куда была обращена барщина с имения Обруб со дня кончины Бобровского;

4) Бельской дворянской опеке нужно прислать опись дома в г. Бельске, принадлежащего малолетним Бобровским, и плацу в м. Клещели;

5) Пружанскому земскому суду предписано о доставлении в Пружанскую дворянскую опеку имущества Бобровского и сведений о барщине с имения Обруб;

6) так как мать упомянутых малолетних, по настоящему браку — Васьневская, находилась некоторое время при покойном протоиерее

Бобровском, она может знать как о его фундушах, так и о долгах, то необходимо и от нее потребовать эти сведения;

7) о всем вышепрописанном дано знать опекунам с тем, чтобы они хранили в целости все вещи, неподверженные в продажу» [5, л. 1—3].

Перш чым даць дазвол на продаж маёмасці М. Баброўскага, гродзенскі губернатар Х. Ховен запытаў у Сената [5, л. 4—7]. На што Сенат адказаў адмовай, таму што «из дела сего не видно:

1) кем именно, по каким долговым обязательствам предъявлены претензии к имуществу умершего протоиерея Бобровского;

2) в чем и на какую сумму состоит претензия того Бобровского к духовному имению Обруб;

3) за сколько продано Пружанской дворянской опекой имущество Бобровского, подверженное тлению.

Поскольку не представлено подробной описи с оценкою назначаемому в продажу имуществу, то Правительствующий Сенат определяет гродненскому губернатору предписать указом, дабы он вышеозначенные сведения и опись представил Сенату немедленно» [5, л. 8].

Гродзенскі губернатар, у сваю чаргу, усклаў падрыхтоўку дадзеных сведчанняў на Пружанскую дваранскую апеку і Гродзенскую палату грамадзянскага суда. Гэтыя інстанцыі паведамілі губернатару аб тым, што:

«1) к имуществу покойного Бобровского простираются следующие претензии: Шерешевской православной церкви на 290 руб., на что имеется собственноручная расписка покойного у церковного старосты; казенные начеты, отпущенные на починку разных церквей, подтверждаемые делами благочиния, что покойный Бобровский получал от протоиерея Ячиновского церквям: Муравьёвской — 66 руб. 97 коп., Циповольской — 52 руб. 90 коп., Беловежской — 65 руб. 80 коп., Ржечицкой — 28 руб. 51 коп., Вожнянской 79 руб. 87 коп., а всего остаётся казенного начета — 446 руб. 35 1/2 коп. — вычет церковного долга, как уведомила Литовская духовная консистория, ею было отчислено из источников, служащих покойному по день его смерти 242 руб. 35 1/2 коп.; осталось затем 47 руб. 64 1/2 коп., а также от частных лиц: протоиерея В. Кургановича 60 руб., издержанных им на удовлетворение прислуги покойного и удержание трех лошадей на собственном корме с 28 сентября 1848 г., дворянина Александра Таргонского по заёмным письмам 13 августа 1848 г. покойным Бобровским выданным; и того же времени в Пружанском уездном суде, совершённом на 600 руб. с законными процентами по день уплаты, причитающимися за неустойку в платеже за расписками соб-

ственноручными покойного: еврею Гальперину — 101 руб. 90 коп.; Цеховцевой — 5 руб. 22 1/2 коп.; Боруху Райману — 14 руб. 82 1/2 коп.; Танебаумовой — 43 руб.; Митиссовой — 21 руб.; поварке Пелагее — 8 руб.; лакею Ивану — 16 руб.; 3-й гильдии купчихе Ловиной за разные напитки — 197 руб. 64 1/2 коп.; Хайке Кринской — 24 руб. 25 коп; извозчику Шмуйле Розенбауму — 10 руб, а всего долга 1595 руб. 84 1/2 коп.;

2) в духовном имении Обруб есть претензия к Бобровскому за обсеменение полей озимым и яровым хлебом при передаче того имения в казну, так как он, принимая то имение 24 июня 1832 г., на основании указа Литовской духовной консистории обязан был уплатить жене предместника своего Клышинской за означенные посевы 200 руб. серебром;

3) из продажи имущества, подвергающегося тлению, выручена сумма 1193 руб. 62 коп., причисляя сюда найденные в наличности 124 руб. 16 коп., составился общий капитал 1317 руб. 78 коп. серебром. Из этого израсходовано на содержание в училище наследника В. Бобровского до отвоза его в Полоцк и наследника И. Бобровского до его кончины 84 руб. 22 коп. и на похороны сего последнего 20 руб. Старшему же из родства М. Бобровскому посредством Санкт-Петербургского правления по продаже выслать ещё доводящуюся часть, и того затем остаётся на удовлетворение должников 1188 руб. 56 коп.» [5, л. 16—18].

Як бачна з дакументаў, памеры даўгоў М. Баброўскага то павялічваліся, то змяншаліся, пастаянна з'яўляліся новыя прэтэндэнты на кампенсацыю страт, што зацягвала вырашэнне спрэчных пытанняў.

У фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў г. Гродна адсутнічае рапарт, які быў адпраўлены ў Сенат Х. Ховенам, таму цяжка сказаць, якія лічбы былі там зафіксаваны. Сенат адказаў губернатару: «Гродненский губернатор рапортом своим от 5 июля 1849 г. просил разрешения Правительствующего Сената на продажу вещей, оставшихся после протоиерея Бобровского с целью уплаты казённых и частных долгов, оказавшихся на покойном в сумме 1595 руб. 84 1/2 коп. серебром. Из собранных Православным Сенатом сведений показывается, что после кончины Бобровского осталось наличными денег 124 руб. 16 коп. серебром, разная движимость, из которой тлению и порче подвергшаяся продана уже с разрешения опеки за 1193 руб. 62 коп. серебром, дом в г. Бельске и плацовое место в м. Клещели; из числа же наследников (племянников. — *Т. П.*) Бобровского Михаил совершенных лет, Владимир взят на воспитание в Архиерейский дом, Иван, также малолетний, умер; наконец, что из вырученных с продажи денег 25 руб. уплачено М. Боб-

ровскому в счет следующей ему части. Православный Сенат, имея в виду, что содержание малолетнего наследника Бобровского не требует пока никаких расходов, долги покойного Бобровского могут быть в большей части уплачены из оставшихся от него денег и из суммы, вырученной уже продажею движимого имущества, определяет: в разрешении продажи вещей, порче не подверженных, отказать и поручить дворянской опеке, чтобы имеющиеся в наличности деньги были обращены опекунам на уплату сомнению не подлежащих долгов, а о продаже драгоценных вещей опека вошла бы с представлением тогда лишь, когда к уплате долгов не будет предстоять никакого другого способа или совершеннолетний наследник будет требовать причитающейся ему части. Об исполнении чего гродненскому губернатору послать указ и уведомить обер-прокурора Святейшего Синода. 14 декабря 1850 г.» [5, л. 29—31].

24 жніўня 1851 г. Сенат нагадаў аб неадкладным выкананні ўказа ад 14 снежня 1850 г. [5, л. 35]. Губернатар Х. Ховен 3 кастрычніка 1851 г. нагадаў аб выкананні ўказа Сената ўсім падначаленым яму ўстановам [5, л. 36]. Пружанская дваранская апека дала наступны адказ: «Для удовлетворения кредиторов по недостатку наличных сумм, вырученных с продажи имущества Бобровского, сделано было предоставление о подтверждении продажи вещей, не подвергающихся порче, на сумму 134 руб. 42 коп. серебром. Однако в продаже этой по учиненному представлению Вашим Превосходительством Сенат отказал, по тому соображению, что кроме наличных, вырученных из продажи имущества, имеется еще дом в г. Бельске и плацовое место в м. Клещели, и как племянники покойного не требуют пока никаких расходов, а правильные долги покойного могут быть уплачены в большей части из оставшихся после покойного денег, суммы вырученной из продажи его движимого имущества, предписал, чтобы имеющиеся в наличности деньги были обращены опекунами на уплату сомнению не подлежащих долгов, а о продаже этих вещей войти с представлением лишь тогда, когда к уплате этих долгов не будет представляться никакого другого способа или совершеннолетний наследник Бобровского будет требовать причитающейся его части. Дабы всё это выполнить, необходимо иметь достаточные сведения о стоимости дома в г. Бельске и плацового места в м. Клещели, и хотя по этому поводу ведётся уже с декабря 1849 г. переписка с Бельской городовой полицией и тамошним земским судом, удовлетворяющих нас ответов оттуда не получено, и не может быть приведён в исполнение указ Правительствующего Сената» [5, л. 38—39].

11 сакавіка 1851 г. бельскі гараднічы данёс губернатару Х. Ховену аб тым, што «при поиске сведений о доме Бобровского в г. Бельске необходимо расспросить проживающего в г. Белостоке Людвига Костецкого и вытребовать от него нужные документы...» [5, л. 45—46]. Наконт плацавага месца ў Клешчалях Пружанская дваранская апека паведаміла 3 снежня 1851 г.: «по розыску, учинённому Бельским земским судом о крестьянах и землях, принадлежавших Бобровскому, известно, что принадлежал к ним человек И. Пищель и два незаконнорожденных мальчика Иван и Мартын Трояны. Опека предписала земскому суду раскрыть на месте в имении Обруб всё об этих крестьянах...» [5, л. 47—49].

Завяршаецца «Дело о продаже имущества протоирея Бобровского за долги» данясеннем губернатару Х. Ховену ад бельскага гараднічага ад 19 чэрвеня 1852 г. аб тым, што «требования Пружанской дворянской опеки по делу об имении Бобровских передано для полного удовлетворения в Белостоцкую городовую полицию», а таксама паведамленнем старшыні Гродзенскай палаты грамадзянскага суда Гліндзіча губернатару Х. Ховену ад 22 верасня 1854 г. аб тым, што «палатой сделаны все необходимые распоряжения по доставлении Пружанской дворянской опекой всех необходимых сведений по выполнению Указа Правительствующего Сената по делу о наследниках покойного Бобровского и о продаже имущества, после него оставшегося» [5, л. 52].

Трэба адзначыць яшчэ адну справу, звязаную з маёмасцю М. Баброўскага, — «Дело по жалобе Юделевского Рафала на невыдачу ему Дворянской опекой ржи, купленной им на торгах после смерти священника Бобровского» [6]. Жыхар г. Пружаны яўрэй Рафал-Меер Вульфавіч Юдзялеўскі піша губернатару Х. Ховену аб тым, што ён «купил 23 июля 1849 г. рожь на публичных торгах при продаже имущества священника Бобровского, за которую полностью уплатил, но по сей день я не удостоился удовлетворения» [6, л. 2]. Матэрыялы справы дазваляюць даведацца аб маёмасным стане пакойнага святара, таргах і г. д.

Такім чынам, у вырашэнні пытання аб лёсе маёмасці вядомага вучонага, святара, прафесара Віленскага ўніверсітэта М. Баброўскага можна ўбачыць шмат парушэнняў як з боку мясцовай духоўнай улады, у асобе віцэ-благачыннага В. Кургановіча, які самастойна зрабіў вопіс маёмасці памерлага, даў распараджэнне аб перадачы яго бібліятэкі бібліяфілу У. Транбіцкаму, так і з боку Пружанскай дваранскай апекі, якая пачала вырашаць пытанне аб лёсе маёмасці вучонага толькі праз тры тыдні пасля яго смерці, не праверыла дакладнасць вопісу, складзе-

нага В. Кургановічам. Вырашэнне дадзенага пытання расцягнулася на некалькі гадоў і выглядала як перасылка дакументаў з адной інстанцыі ў другую (Пружанская дваранская апека — Гродзенская палата грамадзянскага суда — гродзенскі губернатар Х. Ховен — Сенат, і наадварот). Перапіска па гэтым пытанні адкрыла беспарадкі і злоўжыванні з боку членаў Пружанскай дваранскай апекі. Аднак пратэст і скаргі спадчыннікаў — пляменнікаў М. Баброўскага — засталіся без задавальнення, вінаватыя ў растраце засталіся без належнага пакарання. І, у рэшце рэшт, Гродзенская палата грамадзянскага суда прапанавала лічыць дадзеную справу скончанай і перадаць яе ў архіў для захоўвання. Менавіта такія абыякавыя адносіны з боку дзяржаўных інстанцый сталі прычынай беззваротнай страты маёмасці М. Баброўскага.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. *Бобровский П. О.* Михаил Кириллович Бобровский (1785—1848), ученый славист-ориенталист: с портретом, автографами, собственноручными списками и снимками древнейших славянских рукописей и факсимиле почерка знаменитой Супрасльской рукописи: историко-биографический очерк. Спб. : Тип. В. С. Балашева, 1889. VIII, 105 с.

2. *Бобровский П. О.* Судьба Супрасльской рукописи, открытой доктором богословия, магистром философии и филологии М. К. Бобровским: с приложением его автографов, образца собственноручного списка с Супрасльской рукописи и факсимиле подлинной рукописи: историко-библиограф. исслед. Спб. : Тип. В. С. Балашева, 1887. 76 с.

3. *Бобровский П. О.* Бобровский Михаил Кириллович // Критико-биографический словарь русских писателей и ученых : в 6 т. / под ред. С. А. Венгерова. Спб., 1895. Т. 4. С. 29—40.

4. Национальный исторический архив в г. Гродно (НИАБ в г. Гродно). Ф. 1. Оп. 27. Д. 1192 — Дело об оставшемся имуществе после смерти протоирея Бобровского.

5. НИАБ в г. Гродно. Оп. 28. Д. 14 — Дело о продаже имущества протоирея Бобровского за долги.

6. НИАБ в г. Гродно. Оп. 5. Д. 1163 — Дело по жалобе Юделевского Рафала на невыдачу ему Дворянской опекой ржи, купленной им на торгах после смерти священника Бобровского.

7. *Суша А. А.* Баброўскі Міхаіл Кірылавіч // Культура Беларусі: энцыклапедыя : у 6 т. / рэдкал. : Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск, 2010. Т. 1. С. 353—354.

8. *Черепица В. Н.* О судьбе наследства церковного деятеля и ученого слависта М. К. Бобровского (1784—1848) // Весн. ГрДУ імя Янкі Купалы. Сер. 1. Гісторыя, філасофія, паліталогія, сацыялогія. 2007. № 3. С. 38—45.

9. *Янковский П.* Протоиерей Михаил Бобровский // Литовские епархиальные ведомости. 1864. № 1. С. 11—20. № 2. С. 51—66.

10. *Bialokozowicz B.* Miedzy Wschodem a Zachodem. Z dziejow formowania biallouskiej swiadomosci narodowej. Bialystok, 1998. 180 s.


Артыкул паступіў у рэдакцыю 10 чэрвеня 2013 г.